# ПАЛАЖЭННЕ
## аб конкурсе навуковых і творчых работ
## «Купала і Колас, вы нас гадавалі…»
## (да 140-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа)

### 1. Агульныя палажэнні

Мэта конкурсу – развіццё навукова-даследчых навыкаў і творчых здольнасцей студэнтаў, фарміраванне паважлівых адносін да творчай спадчыны класікаў беларускай літаратуры, народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

### 2. Арганізацыя конкурсу

2.1. Арганізатар конкурсу – кафедра гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ.

2.2. Удзел у конкурсе прымаюць студэнты філалагічнага факультэта БДУ.

2.3. Конкурс праводзіцца ў наступных намінацыях:

- навуковая работа па вывучэнні жыцця і творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа;
- паэтычны твор (верш, паэма і інш.), для напісання якога крыніцай натхнення стала паэзія Янкі Купалы і Якуба Коласа;
- празаічны твор (апавяданне, эсэ і інш.), напісаны пад уражаннем ад знаёмства з творчасцю Янкі Купалы і Якуба Коласа.

### 4. Рэкамендацыі па афармленні работ

4.1. Аб'ём навуковай работы – 3–5 старонак, паэтычнага і празаічнага жанру – да 10 старонак фармату А 4 друкаванага тэксту. Памеры палёў: левае – 3 см, правае – 1,5 см, знізу і зверху – па 2 см, тэкст набіраецца ў рэдактары MS Word, шрыфтам Times New Roman, 14 памерам, міжрадковы інтэрвал – 18 пт.

4.2. У кожнай рабоце павінна быць назва (не больш за адзін сказ); указаны прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка (без скарачэнняў), курс, спецыяльнасць, група; пазначана назва намінацыі.

4.3. Работы будуць ацэньвацца па наступных крытэрыях:

- выкананне ўмоў конкурсу, адпаведнасць зместу тэме;
- захаванне патрабаванняў для навукова-даследчых работ (для навуковых работ);
- валоданне вершаванымі памерамі (для паэтычнай формы);
- навізна, арыгінальнасць матэрыялу;
- вобразнасць і творчы падыход.

### 5. Тэрміны правядзення конкурсу

5.1. Першы этап праводзіцца да 16.10.2022. Работы дасылаюцца на электронны адрас кафедры гісторыі беларускай літаратуры: histbel@bsu.by

5.2. Другі этап праводзіцца да 30.10.2022. Журы вызначыць лепшыя работы ў кожнай намінацыі.

## 6. Заяўка на ўдзел

6.1. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна запоўніць анкету **(ДАДАТАК 1)** і адправіць яе з пазнакай «Конкурс» па электронным адрасе: histbel@bsu.by

6.2. Запоўніць згоду на апрацоўку персанальных даных **(ДАДАТАК 2).**

## 7. Падвядзенне вынікаў конкурсу

7.1. Вынікі конкурсу падводзіць спецыяльна створанае журы.

7.2. Вынікі конкурсу будуць падведзены да 15.11.2022 г.

7.3. Пераможцы будуць узнагароджаны на святочным мерапрыемстве, прысвечаным 140-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа.

7.4. Лепшыя творы будуць надрукаваны ў літаратурным альманаху "Маладая плынь".

**ДАДАТАК 1**

## ЗАЯЎКА
## на ўдзел у літаратурным конкурсе «Купала і Колас, вы нас гадавалі…»

Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка ______________________________

Поўная дата нараджэння ______________________________________________

Месца вучобы, курс, група ____________________________________________

Нумар тэлефона ўдзельніка (мабільны) ________________________________

Адрас электроннай пошты для сувязі __________________________________

Намінацыя (тэма) ____________________________________________________

З умовамі ўдзелу ў конкурсе азнаёмлены(-а).

Прымаючы ўдзел у Конкурсе, я згаджаюся з палітыкай апрацоўкі персанальных даных, даю згоду на ўдзел у Конкурсе, а таксама пацвярджаю, што сапраўды з'яўляюся аўтарам і (або) іншым законным праваўладальнікам пададзеных на Конкурс творчых работ і не парушаю аўтарскіх і маёмасных правоў трэціх асоб.

________________ ____________________________

*(дата)* *(поўнае імя, подпіс)*

**ДАДАТАК 2**

Згода на апрацоўку персанальных даных

Я,________________________________________________________
«___»__________года нараджэння, даю згоду Арганізатару конкурсу “Кафедра гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта” (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31) на апрацоўку наступных маіх персанальных даных:

– прозвішча, імя, імя па бацьку;

– дата нараджэння;

– кантактны тэлефон, адрас электроннай пошты.

Мэта апрацоўкі: удзел у літаратурным конкурсе **«Купала і Колас, вы нас гадавалі…»** (далей – Конкурс).

Мне паведамлена(-а**)**, што Кафедра гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта апрацоўвае вышэйназваныя персанальныя даныя з мэтай правядзення Конкурсу, у тым ліку для ідэнтыфікацыі ўдзельнікаў Конкурсу, праверкі захавання імі Палажэння аб правядзенні Конкурсу, вызначэння пераможцаў Конкурсу, афармлення ўсіх неабходных дакументаў для выдачы прызоў пераможцам Конкурсу.

У межах конкурсу я даю згоду на ажыццяўленне наступных дзеянняў з маімі персанальнымі данымі: збор, сістэматызацыя, захоўванне, змяненне, выкарыстанне, абязлічванне, блакіраванне, распаўсюджванне, выдаленне. Мне растлумачаны правы, звязаныя з апрацоўкай маіх персанальных даных, механізм рэалізацыі такіх правоў, а таксама наступствы маёй згоды або адмовы ў такой згоды.

Я азнаёмлены(на) з тым, што:

– згода на апрацоўку персанальных даных дзейнічае 5 гадоў;

– згода на апрацоўку персанальных даных можа быць адклікана шляхам падачы пісьмовай заявы.

________________ ____________________________

*(дата)* *(поўнае імя, подпіс)*